# Правапіс -н-, -нн- у прыметніках
# Фарміраванне метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў праз прымяненне тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо

**А. В. Касцючэнка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі,
СШ № 11 г. Жлобіна



На сучасным этапе развіцця адукацыі асаблівую значнасць набывае фарміраванне і развіццё ў школьнікаў універсальных навучальных дзеянняў.

Для вырашэння асноўных задач адукацыі і выхавання канкурэнтаздольнай асобы неабходна выкарыстоўваць адукацыйныя тэхналогіі як сродак дасягнення метапрадметных вынікаў адукацыі. Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо – адна з тэхналогій, якая накіравана на дасягненне прадметных, метапрадметных і асобасных вынікаў навучання. Мэтай тэхналогіі з’яўляецца фарміраванне творчай асобы, якая здольна крэатыўна думаць, самастойна вучыцца, прымаць узважаныя рашэнні, працаваць з інфармацыяй, вылучаць галоўнае і другараднае, аналізаваць розныя бакі з’яў.

Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення дазваляе рэалізаваць такі метапрадметны кампанент як “Знак”. Мэта гэтага мэтапрадмета заключаецца ў фарміраванні ў школьнікаў навыкаў схематызацыі, неабходных у паўсядзённым жыцці і далейшым навучанні. Бо ў паўсядзённым жыцці чалавек часта сустракаецца з рознымі знакамі і схемамі, напрыклад, калі разбіраецца са схемай маршрутаў аўтобусаў, або калі вывучае інструкцыю новага бытавога прыбора, ці калі расшыфроўвае сімвалы догляду за адзеннем, і нават калі сустракаецца з дарожнымі знакамі. Такім чынам, сам таго не ўсведамляючы, чалавек працуе са знакавымі малюнкамі, схемамі і чарцяжамі.

У рамках метапрадмету “Знак” у школьнікаў фарміруецца здольнасць схематызацыі. Яны вучацца выказваць з дапамогай схем тое, што разумеюць, тое, што хочуць сказаць, тое, што спрабуюць падумаць або падумаць, тое, што хочуць зрабіць. За рознымі графічнымі малюнкамі яны вучацца разумова бачыць той ідэальны змест, які ў ім выказаны. Таму знікае праблема з завучваннем вялікіх аб’ёмаў навучальнага матэрыялу.

У якасці прыкладу прапануем вашай увазе **урок беларускай мовы на тэму “Правапіс -н-, -нн- у прыметніках”.**

**Прадметная мэта:** знаёмства вучняў з правілам напісання -н-,-нн- у прыметніках.

**Метапрадметная мэта:** фарміраванне ўменне выкарыстоўваць набытыя веды ў практычнай дзейнасці і жыццёвых сітуацыях.

**Задачы:**

- дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання -н-,-нн- у прыметніках;
- садзейнічаць выпрацоўцы ўмення вызначаць утваральную аснову і словаўтваральны суфікс прыметніка, карыстацца правілам пры напісанні напісання -н-,-нн- у прыметніках;
- паўплываць на выхаванне пачуцця цікаўнасці да адкрыцця новых ведаў.

**Эпіграф.** Калі ты будзеш цікавіцца многім, ты будзеш чалавекам, які шмат ведае (Сакрат).

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант. Эмацыянальны настрой на ўрок**

**Настаўнік.** Добры дзень. Рада сённяшняй нашай сустрэчы. Няхай той час, які мы правядзём на ўроку разам, будзе цікавым і карысным.



Сёння з вамі мы будзем працаваць у лабараторыі. Я буду вашым навуковым кіраўніком, а вы юнымі лінгвістамі, маімі супрацоўнікамі. А што такое лабараторыя? Давайце звернемся да тлумачальнага слоўніка.

***Лабараторыя*** – спецыяльна абсталяванае памяшканне для вопытаў, тэхнічных або навуковых даследаванняў і адкрыццяў.

Як вы думаеце, ці лёгка зрабіць адкрыццё? Якія людзі могуць гэта зрабіць? А ці можам мы лічыць наш класс лабараторыяй? А хацелі б вы самі зрабіць адкрыццё?

Сёння на ўроку вы паспрабуеце свае сілы ў ролі сапраўдных вучоных, якія рыхтуюцца да самага сур'ёзнага адкрыцця. А памятаеце словы старажытнага філосафа Сакрата: "Калі ты будзеш цікавіцца многім, ты будзеш чалавекам, які шмат ведае". Але новае немагчыма адкрыць, не абапіраючыся на ўжо вядомыя факты.

**II. Актуалізацыя раней вывучанага**

**Тэарэтычная размінка "Ці верыце вы мне?"**

Ці верыце вы мне, што:

- ✓ слова *нясвіжскі* напісана правільна;
- ✓ у словазлучэнні *лісіны характарпрыметнік лісіны* з'яўляецца прыналежным;
- ✓ слова *пазакласны* ўтворана приставачна-суфіксальным спосабам;
- ✓ слова *хатыньскі* напісана правільна;
- ✓ простая форма найвышэйшай ступені параўнання да слова добры – *дабрэйшы;*
- ✓ суфікс -эньк- у слове *даражэнькі* надае памяншальна-ласкальнае значэнне;
- ✓ слова *бела-ружовы* напісана няправільна.

**Настаўнік.** На вашых сталах ляжыць сімвалічны сасуд ведаў. Адзначце, наколькі ён заполнены ведамі па тэме "Прыметнік" на дадзеным этапе. Але памятайце, што вашы веды на працягу урока будуць папаўняцца.

**III. Матывацыйны этап**

**Настаўнік.** Пералічыце вядомыя вам спосабы утварэння прыметнікаў. Давайце вызначым спосаб утварэння прыметнікаў, запісаных на дошцы, і словы ад якіх яны ўтварыліся: *сонны, страшэнны, мышыны, ледзяны.*

✓ Якім спосабам утвораны прапанаваныя прыметнікі? Ад якой часціны мовы?

✓ Што вы заўважылі ў напісанні гэтых прыметнікаў?

✓ Паспрабуйце самастойна акрэсліць тэму даседавання.

✓ Выкарыстоўваючы тэму і дзеясловы, змешчаныя на слайдзе, скажыце, чым мы будзем займацца ў лабараторыі.

***Высвятляць*** ***Даказваць***

***Аналізаваць*** ***Вызначаць***

***Замацоўваць***

**IV. Інфармацыйна-пошукавы этап**

**1. Праца ў парах. Прыём “Адкрыццё новых ведаў”.**

**Заданне.** Адгарніце падручнікі на стар. 141, уважліва разгледзьце табліцу, высветліце, калі ў прыметніках пішацца -н-,-нн-, і складзіце кластар “Правапіс -н-,-нн- у прыметніках”.

**2. Складанне кластара**




**3. Рубрыка “Гэта цікава”**

Прааналізаваць напісанне наступных прыметнікаў

**Гасціны пакой** **Гасцінны народ** **Свіныя вушы**

**V. Трэніровачна-карэкцыйны этап**

**1. Каменціраванае пісьмо ( ля дошкі і ў сшытках)**

**Настаўнік.** Настаў час вынікі даследавання прымяніць на практыцы. На вашых сталах ляжыць картка белага колеру. Вам неабходна замяніць прапанаваныя выразы сінанімічнымі словазлучэннямі “прыметнік + назоўнік”, запісаць, вызначыць суфікс і растлумачыць напісанне **-н-, -нн-**. Узор: вырабы з дрэва – драўляныя вырабы.

*Посуд з гліны –* *рой пчол –*

*тэхніка для вайны –* *праект для дыплома –*

*героі былін –* *перапынак на абед –*

*світар з шэрсці –* *гадзіннік, памечаны імем –*

**2. Гульня “Пазнай слова слова”**

Неабходна назваць назоўнік, утварыць ад яго прыметнік, запісаць і растлумачыць правапіс: *трава, тэлефон, хлеб, гусь, вогнішча, племя, пясок.*

**3. Праца ў парах. Прыём “Карэктар”**

**Настаўнік.** А ці неабходна ў жыцці ведаць правапіс **-н-, -нн-** ? На вашых сталах ляжыць картка блакітнага колеру. Гэта нататка вучня 6 класа, дасланая ў рэдакцыю часопіса “Бярозка”. У ёй хлопчык дзеліцца сваімі ўражаннямі пра наведванне асенняга лесу. Але яна не была надрукавана. Давайце прачытаем яе і высветлім чаму?

*Добры дзень, паважанныя сябры!*

*Хачу падзяліцца сваімі ўражаннямі пра экскурсію ў асені лес.*

*Дзень выдаўся ціхі, бязветранны. У паветры плавала срэбранае павуцінне. Гэта наладжвалі пералёты маленькія павучкі. У небе чуўся жураўлінны крык. Гэта жураўлі ляцелі на поўдзень. За імі цягнуліся гусіныя чароды.*

*Вогнены шар сонца кідаў апошнія праменьчыкі на мурашынныя домікі. На лясннных сцежках, як салдаты, стаялі грыбы.*

*З мяккай журбой я любаваўся апошнімі дзянькамі.*

– Выпраўленне памылак.

**VI. Дыягностыка-карэкцыйны этап**

**1. Праверачны тэст**

**Настаўнік.** Наша работа блізіцца да завяршэння . Праверым, ці можаце вы на самай справе лічыць сябе юнымі лінгвістамі. Вас чакаке невялікі тэст.

Выпішыце нумары слоў, у якіх неабходна напісаць

а) -н- б) -нн-

1. песе…ы 6. вераб’і…ы

2. сві…ы 7. ако…ы

3. куры…ы 8. люстра…ы

4. страшэ…ы 9. імя…ы

5. алавя…ы 10. тапалі…ы

2. Узаемаправерка

Слайд 15

**VII. Падагульняльна-рэфліксійны этап**

**Настаўнік.** Скажыце, якое адкрыццё для самога сябе вы зрабілі падчас даследавання?

Як бы вы ацанілі сваю работу на ўроку?

а) я ўсё зразумеў(ла), магу гэты матэрыял растлумачыць другому;

б) я ўсё зразумеў(ла), але растлумачыць другому не вазьмуся;

в) для поўнага разумення мне трэба яшчэ папрацаваць;

г) я нічога не зразумеў (ла).

А зараз давайце вернемся да сімвалічнага сасуда і адзначым, на колькі папоўніліся вашы веды пасля правядзення сённяшняга даследавання.

**VIII. Дамашняе заданне**

§ 40, практ. 247